## ДУК "ВОРАНАЎСКАЯ РАЁННАЯ БІБЛІЯТЭКА"

**01 кастрычніка** да **Дня пажылых людзей** ва ўсіх установах ДУК "Воранаўская раённая бібліятэка" арганізавана акцыя "Ад чыстага сэрца, добрымі словамі…". Бібліятэкары наведалі чытачоў пажылога ўзросту з пажаданнем добрага здароўя, настрою, актыўнага даўгалецця.

**02 кастрычніка** прайшла **акцыя – віншаванне "Нізкі паклон табе, Настаўнік!".** Місявіцкая сельская бібліятэка запрасіла настаўнікаў УА "Місявіцкая пачатковая школа" на святочны канцэрт.

**14 кастрычніка акцыю – віншаванне "За жизнь тебя благодарю"** да Дня Маці арганізавалі супрацоўнікі Воранаўскай раённай бібліятэкі сумесна з ГА "Беларускі Саюз жанчын" і Беларускім прафсаюзам работнікаў культуры, інфармацыі, спарта і турызму. Працавалі тэматычныя выставы "Прекрасна женщина с ребёнком на руках…" і "Немеркнувший свет материнской любви". Гледачам прапанавалі прагляд відэароліка, канцэртныя нумары. Са словам віншавання і падзякі дзеці ўручылі сваім мамам кветкі.

Падчас акцыі добрых пажаданняў "Падары маці сваё сэрца" супрацоўнікі аддзела абслугоўвання і інфармацыі з дапамогай бібліёбуса павіншавалі самых актыўных чытачоў са святам. Жанчыны – мамы атрымалі святочныя паштоўкі, пачулі ў свой адрас шчырыя пажаданні добрага здароўя і добрага настрою.

Да Дня Маці Місявіцкая сельская бібліятэка прымеркавала майстар – клас па вырабу віншавальных паштовак, а Нацкая сельская бібліятэка майстар – клас "Наши руки не для скуки" па вырабу паштовак і аплікацый.

Акцыю "Дзякуй табе, дарагая матуля!" для чытачоў – матуль, якія прыйшлі ў бібліятэку, арганізавалі Місявіцкая сельская і Радунская гарпасялковая бібліятэка.

Акцыю – віншаванне "Мама, слова дарагое" арганізавала Нацкая сельская бібліятэка, наведала шматдзетныя сем'і. Са словамі віншавання матулі атрымалі кветкі і сувеніры, зробленыя рукамі дзяцей.

**7 лістапада,** напярэдадні **Дня Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі,** ва ўстановах ДУК "Воранаўская раённая бібліятэка" працавалі тэматычныя выставы і тэматычныя паліцы. Раённая бібліятэка арганізавала выставу – прагляд "Час Вялікага Кастрычніка", прэс – хвілінку "Кастрычніцкая рэвалюцыя ў зеркале гісторыі" – Воранаўская дзіцячая бібліятэка.

**3 снежня,** да **Міжнароднага дня інвалідаў** бібліятэкары ўстановы арганізавалі акцыі дабрыні "Вам дорым дабрыню і радасць", якія напамнілі аб тым, што побач з намі жывуць людзі з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі, якія патрабуюць нашай увагі.

Супрацоўнікі Воранаўскай дзіцячай бібліятэкі наведалі ДУА "Цэнтр карэкцыйна – развіваючай адукацыі і рэабілітацыі Воранаўскага раёна". Для дзяцей – інвалідаў арганізавалі ўрок міласэрнасці "Тут сэрцу кожнаму цёпла". Прапанавалі пазнаёміцца з прыгожымі і маляўнічымі часопісамі і кнігамі, якія знаходзяцца ў фондзе дзіцячай бібліятэкі. Дзеці атрымалі невялічкія сувеніры.

## ТАЛЕНТЫ ЛІТАРАТУРНАГА СЛОВА

Адзначаліся літаратурныя юбілеі пісьменнікаў і паэтаў.

Да 90 – годдзя з дня нараджэння У.С.Караткевіча, беларускага паэта, празаіка, драматурга, публіцыста, перакладчыка, класіка беларускай літаратуры, які ўпершыню звярнуўся да жанру гістарычнага дэтэктыву, арганізаваны цыкл мерапрыемстваў.

Воранаўская раённая бібліятэка арганізавала літаратурную гадзіну “Вянок цудоўных твораў”, Воранаўская дзіцячая бібліятэка – урок падарожжа “Летапісец народнага лёсу”.

Круіз – гульню “Жывое цуда казкі” па старонках казак Джані Радары арганізавала Воранаўская дзіцячая бібліятэка.

У літаратурную гасцёўню “Капітан на караблі дзіцячай літаратуры”, арганізаваную да 85 – годдзя з дня нараджэння Э. Скобелева, запрасіла Воранаўская дзіцячая бібліятэка. Дзеці пазнаёміліся з лепшымі творамі празаіка, былі прачытаны лепшыя творы для дашкольнага чытання.

Віктарыну “Яе любоў і копат” па творах Ніны Галіноўскай, дзіцячай паэткі, таленавітага майстра малых жанраў, якая пісала пра гульні і забавы дзяцей, запрасіла Воранаўская ДБ.

## У ЗГОДЗЕ З ПРЫРОДАЙ

У 2020 годзе бібліятэкамі працягваецца работа па бібліятэчнай праграме ***“Наш дом - прырода” на 2016-2020гг.***

Што такое Чырвоная кніга, як і калі з’явілася ідэя яе стварэння? Аб гэтым і шмат іншых цікавых фактах даведаліся слухачы на гадзіне цікавых паведамленняў “Лістая Чырвоную кнігу”, аграніазаваную Місявіцкай сельскай бібліятэкай.

## ПРА ЗДАРОВЫ ЛАД ЖЫЦЦЯ.

У 2020 годзе бібліятэкамі працягваецца работа па бібліятэчнай праграме ***“Быць здаровым – гэта здорава” на 2016-2020гг.***

Гутарку “Шкодным звычкам – НЕ!” для навучэнцаў УА “УПК Нацкія яслі – сад - сярэдняя школа” арганізавала Нацкая СБ. Удзельнікам прапанавалі агляд літаратуры па тэме, заклікалі весці здаровы лад жыцця і не паддавацца згубным схільнасцям.

Гутарка – разважанне “Курэнне – гэта небяспечна” (Бастунская ІСБ) і ўрок здароўя “Нават не спрабуй!” (Радунская ГПБ) былі прымеркаваны да Міжнароднага дня адмовы ад курэння з мэтай папулярызацыі здаровага ладу жыцця.

Воранаўская раённая бібліятэка ў цэнтры пасёлка арганізавала акцыю “Меняем цыгарэту на канфету”. Бібліятэкары заклікалі курыльшчыкаў адмовіцца ад цыгарэты на адзін дзень і прапаноўвалі абмяняць свае канфеты на цыгарэты. Да акцыі далучыліся і іншыя бібліятэкары раёна.

На ўрок здароўя “Каго забіла капля нікаціна” Воранаўская ДБ запрасіла ўрача – гігіяніста Сухалет Г.А. Навучэнцы 8 класа УА “Воранаўская СШ” даведаліся аб шкодзе нікаціна на растучы арганізм, пра цяжкія захворванні ў тых, хто курыць. Быў прадэманстраваны відэаролік “Горкая мода на атруту”, прапанаваны агляд літаратуры.

### 1 снежня – Сусветны дзень прафілактыкі ВІЧ/СНІД

Урок перасцярогі “Ціхі вір чакае новыя ахвяры” арганізавала Воранаўская раённая бібліятэка для вучняў 10 “Г” класа УА “Воранаўская СШ”. Бібліятэкары паведамілі сумную статыстыку па рэспубліцы, вобласці і раёне. Былі яшчэ раз агучаны меры перасцярогі і шляхі заражэння ВІЧ – інфекцыяй. Выстава “Усім светам супраць СНІДУ” прапанавала тэматычную літаратуру, перыядычныя выданні, буклеты, памяткі. Бібліятэкары прызвалі навучэнцаў прытрымлівацца здаровага ладу жыцця.

Вусны часопіс “Адзін свет – адна надзея” арганізаваны ў Забалацкай ІСБ. Працавала тэматычная выстава. Вучням старэйшых класаў было прапанавана адказаць на пытанні ананімнай анкеты.

Інфармацыйная гадзіна “Вірус запретного плода” з праглядам відэа роліка прайшла ў Місявіцкай сельская бібліятэцы, выстава – прагляд “Не зламай свой лёс” арганізавана ў Погародзенскай сельскай бібліятэцы.

## КАРЫСТАЛЬНІКАМ ПРАВАВЫЯ ВЕДЫ

У 2020 годзе бібліятэкамі працягваецца работа па бібліятэчнай праграме ***“Патрыёт” на 2016-2020гг.***

Прававы дыялог “Па гэтых законах табе жыць” арганізавала Воранаўская дзіцячая бібліятэка. Бібліятэкары пазнаёмілі дзяцей з галоўным Законам Беларусі – Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь. Вучні даведаліся пра свае правы і абавязкі. У цікавай гульнёвай форме адшукалі правапарушэнні дзіцячых правоў праз творы мастацкай літаратуры.

## ДУХОЎНА - МАРАЛЬНАЕ ВЫХАВАННЕ

Свята Ражства Хрыстова і Новага года бібліятэкі ўстановы адзначылі шэрагам мерапрыемстваў. Навагодняя гульня – град “Новыў год, Новый год – в сказку добрую зовёт”, навагодні серпантын “Новый год отметим вместе – танцем, юмором и песней”, сустрэчы “Нынче вся земля светла и звонят колокола”, літаратурна – музычная феерыя “Чарует белой сказкой сново светлое Рождество Христово” падарылі добры настрой не толькі дзецям, але і дарослым. Раставыя лялькі Мікі і Міні Маусы дадалі новыя фарбы ў віншаванні на Новы год.

На конкурс малюнкаў “Прыбяры прыгожа ёлку” запрасіла дзяцей Радунская ГПБ.

Бібліятэка на калесах арганізавала віншаванне жыхароў аддаленых вёсак. Навагоднія пажаданні і салодкія падарункі дарылі чытачам Дзед Мароз, Снягурка, Мікі і Міні Маус.

## БІБЛІЯТЭКА - ДЗЕЦЯМ

На прэзентацыю “Неверагодныя музеі міра” запрасіла Воранаўская дзіцячая бібліятэка. Вучні групы падоўжанага дня пазнаёміліся з неверагоднымі музеямі: музеям у дупле дуба, музеям валуноў, шакалада, запалак. Затым адказвалі на пытанні віктарыны.

Падчас восеньскіх канікул Воранаўская дзіцячая бібліятэка запрасіла вучняў 1-2 класаў школьнага лагера 1- га атрада “Умка” (УО “Воранаўская СШ”) на экскурсію “Кнігі – першы сябар”.

Таксама арганізавала экскурсію ў бібліятэку “Бібліятэка, кніга, я – дружная сям’я” для вучняў атрада “Фіксікі” Пазнаёміла з кніжным фондам, даведкавымі выданнямі, правіламі карыстання, і як знаходзіць патрэбную інфармацыю. Дзеці прынялі ўдзел у разгадванні загадак. Затым адбыўся прагляд мультфільма.

На ўроке ББВ “Адказваюць на пытанні даведачныя выданні”, арганізаваным Воранаўскай ДБ для вучняў школьнага лагера 3-га атрада “Смяшарыкі”, дзеці пазнаёміліся з кніжнымі серыямі “Мая першая энцыклапедыя”, “Сто фактаў”, “Маленький профессор”, “Хочу знать”. Вучыліся ў гульнёвай форме шукаць адказы на розныя пытанні, знаходзіць пэўную інфармацыю.

“Падарожжа па маршруту добрых пачуццяў, учынкаў, добрых спраў” для навучэнцаў Радунскага СПЦ, з мэтай фарміравання такіх маральных паняццяў, як дабрыня, ветлівасць арганізавала Радунская ГПБ.

## Адзіны Дзень бяспекі

Пазнавальна – прафілактычную гадзіну “При пожаре не сидим, набираем «101»” арганізавала Пераганцаўская сельская бібліятэка, падчас якой гаварылі аб неабходнасці выконваць правілы пажарнай бяспекі, правілах выкарыстання первічных сродкаў пажаратушэння. Дзеці ўдзельнічалі ў конкурсах, адказвалі на пытанні віктарыны “Помні правілы”.

Каб Новы год не быў азмрочаны пажарамі і іншымі найзвычайнымі сітуацыямі, трэба прытрымліватца правілаў бяспекі. На сустрэчу з інспектарам прапаганды і ўзаемадзеяння

з грамадскасцю МНС Хлюст В.Ю. запрасіла дзяцей Воранаўская ДБ. Мерапрыемства праходзіла ў межах акцыі “Безопасный Новый год!”. Інспектар расказаў аб правілах выкарыстання піратэхнікі, электраабсталявання. Тэматычны відэаролік расказаў аб правілах паводзін на лёдзе, як правільна вызваць выратавальнікаў і як сябе паводзіць да іх прыезда.

Пазнавальную гадзіну “Беражы энэргію” арганізавала Забалацкая ІСБ. Дзеці адправіліся ў падарожжа па звычайнай кватэры. Пабывалі на кухне і ваннай комнаце, зазірнулі ў гасціную. Нагадалі аб правілах у быце, дзякуючы якім мы будзем эканоміць прыродныя багацці і сямейны бюджэт. Адгадвалі загадкі, расказвалі вершы.

Дзе выкарыстоўваецца электраэнэргія, дзе яна выпрацоўваецца, і як прыходзіць да нас у дом даведаліся дзеці на ўроку “Как на планете дружат с энергией взрослые и дети”, арганізаваным Бастунскай ІСБ.

Урок “Что сегодня сбережёшь – завтра пригодится” арганізавала Місявіцкая СБ. Навучэнцам УА “Місявіцкія яслі – сад – пачатковая школа” прывівалі навыкі беражлівасці, вучылі эканоміць энэргарэсурсы на бытавым узроўні.

На ўрок – гутарку “Я в этой стране живу, свет и воду берегу” запрасіла Больтішская ІСБ, навучэнцы УА “Больтішская базавая школа” шукалі самыя простыя рашэнні, якія дапамогуць зберагчы электрычную энэргію.

Гульню – падарожжа “По стране энергосбережения” для маленькіх школьнікаў арганізавана Радунская гарпасялковая бібліятэка. Сумесна з бібліятэкарамі дзеці здейснілі захапляючыя і пазнавальныя падарожжы па гарадах Вадасеці, Энэргасеці, Электрасеці, пад час якіх вучыліся эканоміць электраэнэргію, газ, ваду, цяпло, берагчы і захоўваць навакольнае асяроддзя. Дзеці ўдзельнічалі ў конкурсах – заданнях.

## АМАТАРСКІЯ АБ’ЯДНАННІ ЗАПРАШАЮЦЬ

Віктарыну “Для тых, хто хоча быць здаровым” арганізавала для ўдзельнікаў аматарскага аб’яднання “Непаседы” Воранаўская ДБ. Загадчык рассказала аб здаровым харчаванні, прадуктах, якія станоўча ўплываюць на арганізм чалавека, і прадуктах, якія наносяць шкоду (чыпсах, жвачках, кола, цукерках і інш.). Дзеці адказвалі на пытанні тэматычных загадак.

## УДАСКАНАЛЬВАЕМ ПРАФЕСІЙНАЕ МАЙСТЭРСТВА

Павышэнне кваліфікацыі, удасканаленне прафесіяналізму бібліятэчных работнікаў раёна з’яўлялася адным з вядучых напрамкаў метадычнай работы.

30 кастрычніка арганізаваны круглы стол “Краязнаўчая бібліятэка як аснова захавання нацыянальнай спадчыны. Сучасны падыход да краязнаўчай работы”, падчас якога разглядаліся наступныя пытанні: краязнаўчая дзейнасць бібліятэк: традыцыі і навацыі; крыніцы і метады выяўлення краязнаўчых дакументаў, размяшчэнне і захаванне краязнаўчага фонду; таксама бібліятэкары дзяліліся вопытам работы.

20 лістапада на базе філіяла “Радунская гарпасялковая бібліятэка” арганізавана школа прафесійнага майстэрства “Бібліятэка – тэрыторыя чытання і выхавання дзяцей і падлеткаў”. Разглядаліся пытанні арганізацыі дзіцячага чытання, выкарыстанне інтэрнэт – тэхналогій у практыцы работы бібліятэк, творчыя формы і метады работы з дзіцячым чытачом, нагадваліся новыя аўтары і актуальныя жанры дзіцячай кнігі XXI стагоддзя.

Арганізоўваліся практыкумы для бібліятэкараў без спецыяльнай адукацыі, таксама практыкум “Паспяховае планаванне – фартар дзейнасці бібліятэк”.